1. *Дожына, Н.* Пеўчыя рукапісныя помнікі Супрасльскай традыцыі ў даследаваннях сучасных музыколагаў / Studia bialorutenistyczne – Беларусазнаўчыя даследаванні: зб. навук. прац // рэд. М. Коржэневскі, М. Саевіч. – Вып. 8. – Люблін, 2014. – С. 69–79.

2. *Dozhina, N.* Literal Notation Research of Belarus Motet / N. Dozhina // Journal of Xinjiang Arts Institute. – 2015. – № 4 – S. 22–26 (на китайском языке).

***Л. І. Доўнар,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*прафесар кафедры бібліятэчна-інфармацыйнай*
*дзейнасці Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# СУЧАСНЫЯ ЦЭНТРЫ КНІГАЗНАЎЧЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСІ: ПАМІЖ ТЭОРЫЯЙ І ПРАКТЫКАЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вылучыўшы аб'ектам нашага вывучэння кнігазнаўчыя даследаванні, якія праводзяцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ) і Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАНБ), паспрабуем звярнуць увагу на асноўныя тэарэтыка-метадалагічныя праблемы, прадстаўленыя ў працах супрацоўнікаў аддзелаў і сектараў кнігазнаўства, аддзелаў рэдкіх кніг і рукапісаў, што выступаюць аднымі з галоўных цэнтраў сучасных кнігазнаўчых даследаванняў у Беларусі.

**НББ.** Гісторыя кнігазнаўчых даследаванняў у НББ, пачатых у 1920-я гг., цесным чынам звязана з эвалюцыяй і станаўленнем арганізацыйнай структуры бібліятэкі, яе статусным значэннем, прыцягваннем да працы адпаведных спецыялістаў. Нягледзячы на тое, што ў 1922 г. у структуры бібліятэкі быў вылучаны фонд старадрукаваных і рэдкіх кніг, пазней сектар (з 1970 г.), самастойная адзінка – аддзел рукапісаў, рэдкай кнігі і старадрукаў – зацвярджаецца толькі 1 кастрычніка 1979 г., 1 верасня 2005 г. на яго базе засноўваецца навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства (НДАК).

Сёння ў структуры НДАК НББ (з 2003 г. – загадчык Г. У. Кірэева) пяць сектараў: арганізацыі і навуковай апрацоўкі

фондаў, абслугоўвання карыстальнікаў, захоўвання фондаў, музейнай дзейнасці, навукова-праектнай работы, Музей кнігі, асноўнымі кірункамі работы якіх з’яўляюцца: ажыццяўленне абслугоўвання карыстальнікаў; збор, арганізацыя, навуковая апрацоўка і захоўванне рукапісных і архіўных матэрыялаў, старадрукаваных, рэдкіх і каштоўных выданняў, музейных прадметаў згодна з профілем [5]. Акрамя таго, супрацоўнікі аддзела ўдзельнічаюць у арганізацыі культурна-асветніцкай і экскурсійнай, выдавецкай дзейнасці, а галоўнае – НДАК НББ выступае каардынацыйным цэнтрам кнігазнаўства ў рэспубліцы ў навуковым, метадычным і бібліяграфічным кірунках [4], аб чым адзначалі Т. І. Рошчына, Г. У. Кірэева, Л. Г. Кірухіна, Т. А. Сапега.

Пасля стварэння аддзела, з 1979 г. да 1991 г. здзейснены 11 арыгінальных публікацый (аўтар 9 з іх – В. Н. Дышыневіч, галоўны бібліёграф аддзела), у якіх закраналіся істотна важныя *пытанні скарыназнаўства: мастацкага, гістарыяграфічнага, крыніцазнаўчага, бібліяграфічнага;* у іншых артыкулах звярталася ўвага на *вывучэнне гістарычных кнігазбораў* (Т. І. Рошчына, загадчык аддзела ў 1983–2003 гг.). За перыяд з 1991 да 2015 гг. з’явілася каля 450 аўтарскіх публікацый супрацоўнікаў НДАК НББ. І мае рацыю В. Герасімаў, калі піша, што «за пару дзесяцігоддзяў адраджэння ХХ – пач. ХХІ ст. і існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь у бібліятэчнай справе і айчынным кнігазнаўстве зроблена столькі, колькі, магчыма, за пару стагоддзяў да таго» [1]. У агульным аб’ёме публікацый *большасць з іх прысвечана разгляду кніжных калекцый, кніжных помнікаў з фондаў НББ*. У 1990-я гг. актуальнымі тэмамі выступалі *праблемы вяртання ці рэстытуцыі дакументальных помнікаў, бібліяграфічны ўлік кніжных помнікаў, рэканструкцыя гістарычных кнігазбораў, праблемы захавання кніжнай спадчыны*. Новыя змены ў жыцці Рэспублікі Беларусь патрабавалі вырашэння і тэарэтычных пытанняў, найперш, звязаных з вызначэннем *зместу паняцця «нацыянальны дакумент»*, да асвятлення якога былі прыцягнуты спецыялісты і іншых аддзелаў НББ, а таксама і іншых бібліятэк, і ВНУ: у 1995 г. апублікаваны артыкул па адпаведнай тэме Р. М. Чыгіровай, А. В. Мураўёвай, Т. І. Рошчынай; у 2010 г. – зборнік «Нацыянальны дакумент як аб’ект дзейнасці бібліятэк Беларусі»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(складальнік Т. В. Кузьмініч). На *праблемы беларускамоўнай кнігазнаўчай тэрміналогіі* звяртаюць увагу Т. І. Рошчына і Н. С. Саверчанка, складальнікі «Руска-беларускага тэрміналагічнага слоўнічка» (1997).

Спрыялі росту зацікаўленасці кнігазнаўчай праблем яе нераспрацаванасць, заснаванне і выданне зборніка навуковых артыкулаў «Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі», які ўключае артыкулы як тэарэтычнага, так і практычнага характару па пытаннях кнігазнаўства, гісторыі кнігі, культуралогіі (з 1995 да 2017 г. выйшла 20 выпускаў), арганізацыя і правядзенне з 1998 г. міжнародных навуковых кнігазнаўчых чытанняў (да 2017 г. прайшло 13 міжнародных чытанняў) і адпаведна выданне матэрыялаў чытанняў (з 2000 г.), у якіх яскрава адлюстроўваецца іх канцэптуальны кірунак на адраджэнне беларускай кніжнай культуры. У 2000-я гг. набываюць асаблівую значнасць *практычныя пытанні* распрацоўкі фармата BELMARC для старадрукаў, яго выкарыстанне ў *стварэнні нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі* (Г. У. Кірэева), абмяркоўваецца праект удзелу Беларусі ў міжнароднай праграме «Памяць свету» і адпаведна распрацоўваецца і прадстаўляецца праграма «Памяць Беларусі» Radziviliana (Т. І. Рошчына); больш ўвагі звяртаецца на *гісторыю кніжнай культуры рэгіёнаў Беларусі* (Т. І. Рошчына, Г. У. Кірэева, Н. І. Раманава, Т. А. Сапега), застаюцца актуальнымі пытанні, звязаныя з *вызначэннем і даследаваннем кніжных помнікаў* (Г. У. Кірэева, Т. І. Рошчына, Л. І. Станкевіч), *персанальных кніжных калекцый і методыкі працы з імі* (Т. І. Рошчына, Л. Д. Сільнова), закранаюцца *праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства* (Н. Я. Верас, Г. У. Кірэева, Ю. М. Лаўрык, Т. І. Рошчына, Н. С. Саверчанка), разглядаецца стан і перспектывы *міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне кнігазнаўства* (Т. І. Рошчына, Н. С. Саверчанка). Новае гучанне надаецца маладымі спецыялістамі – аспірантамі БДУКМ (як Т. А. Сапега) *тэарэтычным пытанням міждысцыплінарнага характару – кнігазнаўства і музеязнаўства*: пра вызначэнне паняцця «музей кнігі», асаблівасці функцыянавання кнігі ў музейным асяроддзі, вызначэнне паняццяў «кніга – музейны прадмет», «кніга – музейны экспанат», «кніжны помнік», «друкаваная кніга як феномен культуры»; Н. Я. Верас звяртае ўвагу на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*сутнасць інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў у галіне адукацыі і педагагічных навук, вывучае тэрмін «бібліяграфічная рэдкасць» адносна беларускай кнігі, мініяцюрныя выданні*; некаторыя тэарэтыка-метадалагічныя пытанні ў кантэксце культуралагічных падыходаў асвятляюцца Т. У. Карнілавай – гэта *вызначэнне тэрміна «беларускія кірылічныя выданні», аксіясфера кнігі*.

*Гісторыі і метадалогіі кнігазнаўства, тэарэтычным пытанням кніжнай культуры* ў апошняе дзесяцігоддзе прысвячаюць свае публікацыі Г. У. Кірэева, Т. І. Рошчына, Т. А. Сапега, Т. У. Салавей, Л. Д. Сільнова. Атрымалі далейшае развіццё *перспектыўныя пытанні фарміравання Дзяржаўнага рэестра кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь* (Т. І. Рошчына), *захавання кніжнай спадчыны* – праграма «Скарыніяна» (Г. У. Кірэева); рэалізаваны выпуск не менш 20 электронных выданняў, сярод якіх *метадычныя матэрыялы*: «Кніжныя помнікі: выяўленне, апісанне, захоўванне, выкарыстанне» (2013), *даследаванні кнігазбораў*: Сапегаў (2011), Храптовічаў (2010), Радзівілаў (2009) і *кніжных помнікаў*: інкунабул (2008), Слуцкага Евангелля (2008) і інш. Да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання супрацоўнікі НДАК НББ прынялі ўдзел у праектах: *апісанне захаваных кніг Ф. Скарыны ў бібліятэках розных краін свету* – «Сусветная спадчына Францыска Скарыны», *факсімільнае ўзнаўленне* «Кніжнай спадчыны Францыска Скарыны», што можа стаць базавай крыніцай як для кнігазнаўчых даследаванняў, так і важкім адукацыйным рэсурсам. Выдадзены таксама ў двух частках матэрыялы Міжнароднага кангрэса «500 гадоў беларускага кнігадрукавання», у рамках якога адбыліся XIII Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні (2017). Такім чынам, ва ўзаемадзеянні выступілі навуковы і практычна-выдавецкі кірункі, за аснову якіх быў узяты інструментарый прамоцыі (папулярызацыі) унікальнай спадчыны Ф. Скарыны, што можа стаць паказальным для прымянення ў дыдактычных занятках і заахвочвання кніжнай культурай, даследаванні якой працягваюцца і не змяншаюцца.

**ЦНБ НАНБ**. Першыя крокі бібліятэкі ў галіне навуковага вывучэння кнігі, яе гісторыі, кніжных помнікаў звязаны з дзейнасцю Інстытута беларускай культуры (1925), які ў 1929 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

быў перайменаваны ў Беларускую акадэмію навук, адпаведна была адкрыта і Бібліятэка АН БССР. У 1964 г. быў арганізаваны аддзел рэдкіх кніг. У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 25 мая 1990 г. Бібліятэка Акадэміі навук Беларусі была залічана да навукова-даследчых устаноў у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, а таксама гісторыі кнігі [3]. Істотны ўклад у развіццё гісторыі кнігі і бібліятэчнай справы – зборнікі навуковых работ бібліятэкі: «Из истории книги, библиотечного дела и библиографии в Белоруссии» (1970, 1972), «Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии» (1974), «Книговедение в Белоруссии» (1977), «Из истории книги в Белоруссии» (1979), «Книга в Белоруссии. Книговедение, источники, библиография» (1981, 1983, 1988), «Кніжная культура Беларусі: Да 500-годдзя з дня нараджэння Ф. Скарыны» (1990); вучэбны дапаможнік Н. Ю. Бярозкінай «Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.)» (1998, 2000), яе ж манаграфія – «Библиотеки и распространение научных знаний в Беларуси (XVI–XX вв.)» (2011) і інш.

Адну з вядучых роляў у кірунку гісторыка-кніжных даследаванняў адыгрывае ў бібліятэцы Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў, які складаецца з трох сектараў: кнігазнаўства, навуковай апрацоўкі рукапісаў, абслугоўвання. Дынаміка выдання артыкулаў супрацоўнікаў аддзела выглядае наступным чынам: у 1960-я гг. былі дзве публікацыі, у 1970-я – 29, у 1980-я – 52, у 1990-я – 73, з 2000 да 2014 г. – 493 публікацыі, сярод якіх значную частку складаюць навукова-папулярныя матэрыялы [6, с. 261–350]. Да 50-годдзя стварэння аддзела бібліятэка выдала зборнік навуковых артыкулаў і публікацый «Путь длинною в полстолетия» (2015), у якім асвятляецца дзейнасць аддзела, уключаны матэрыялы, прысвечаныя гісторыі кнігі, бібліяграфіі, даследаванням рукапіснай спадчыны вядомых дзеячаў навукі і культуры Беларусі, успаміны супрацоўнікаў аддзела. Да гісторыі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў звярталіся В. В. Білевіч, Н. Ю. Бярозкіна, Л. І. Збралевіч, А. В. Сцефановіч, А. І. Чарняева.

Разам з тым, што большасць публікацый супрацоўнікаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў прысвечана *навуковаму даследаванню і прамоцыі фондаў ЦНБ НАНБ і калекцый аддзела*, трэба

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзначыць, што ўпершыню ў кантэкст энцыклапедычнага артыкула пра кнігазнаўства (у 1986 г. у т. 3 «Энцыклапедыі літаратура і мастацтва») Л. І. Збралевіч (загадчык аддзела ў 1968–1990) увяла звесткі пра *вытокі беларускага кнігазнаўства*, звязаўшы яго з Віленскім універсітэтам, адзначыла ўклад І. Лялевеля і А. Багаткевіча. Яна таксама звяртала ўвагу на *пытанні даследавання мясцовых выданняў Беларусі і гісторыі беларускай кнігі*, шэраг энцыклапедычных артыкулаў на беларускай мове прысвяціла разнастайным аспектам гісторыі кнігі: *рэдкай і старадрукаванай кнізе*, *палеатыпам*, *бібліяфільству*, *букіністычнай кнізе*, *прыватным бібліятэкам*. У другой палове 1980-х гг. былі актуалізаваны *пытанні даследавання беларускага чытача і навуковай кнігі* (І. Я. Яўжэнка), у 1990-я гг. асаблівая ўвага ўдзялялася *раскрыццю рукапісных калекцый аддзела* (Я. М. Кісялёва, М. М. Ліс). На пачатку 2000-х гг. была актуалізавана навукова-даследчая праца па *вывучэнні рукапіснай спадчыны беларускіх татараў* (М. У. Тарэлка, А. І. Цітавец, І. А. Ганчарова, І. А. Сынкова), *кірылічных выданняў XVI–XVIII стст.* (у 2014 г. зацверджаны новы праект па выпуску каталога; А. В. Сцефановіч, А. І. Цітавец), *па падрыхтоўцы факсімільных выданняў* [падпольных і партызанскіх газет, часопісаў, лістовак часоў Вялікай Айчыннай вайны; Брэсцкая (Радзівілаўская) Біблія, 1563]. Асабліва вызначальным стаў для аддзела серыяльны праект па складанні і *выпуску каталога выданняў з фонду ЦНБ НАНБ* «Библиотека Радзивиллов Несвижской ординации» (з 2010 да 2017 г. выйшлі 10 кніг, складальнікі – А. В. Сцефановіч, М. М. Ліс), дзякуючы якому вырашаюцца пытанні не толькі *бібліяграфічнай рэканструкцыі гістарычнага кнігазбора*, але праблемы яго *навукова-тэрміналагічнага забеспячэння* (кожнае выданне змяшчае «Терминологический словарь», паказальнікі друкароў і выдаўцоў, аўтараў, каментатараў, перакладчыкаў, уладальнікаў дакументаў, выкарыстаных крыніц), *дапаўняецца даведкава-крыніцазнаўчая і гістарыяграфічная база па гісторыі кнігі і кнігазнаўства*. На пачатку 2010-х гг. супрацоўнікі аддзела значную ўвагу надавалі падрыхтоўцы навукова-папулярных матэрыялаў для суправаджэння *электронных тэматычных і персанальных інтэрнэт-выстаў паводле фондаў ЦНБ НАНБ*: «Рукапісы не гараць» (М. М. Ліс, Т. І. Жук), «Новости временных лет», «История в рецептах» (І. Л. Мурашова).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Актыўна супрацоўнічае аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў з іншымі структурнымі падраздзяленнямі ЦНБ НАНБ у рэалізацыі агульнабібліятэчных і адначасова міжнародных праектаў па кніжнай культуры, працягваючы традыцыю раскрыцця рукапісных і друкаваных калекцый са сваіх фондаў і методыку працы з імі: «Книжная культура Беларуси и России. Комплексные исследования в контексте историко-культурного взаимодействия» (2010), «Книжная культура в контексте инновационного развития общества» (2014), «Берковские чтения» (з 2011 г.), «Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития» (з 2014 г.). Тым самым вырашаюцца задачы вызначэння ролі і месца кнігазбораў у сістэме культурных каштоўнасцей Беларусі і сусветнай кніжнай культуры, распрацоўваюцца кірункі актуалізацыі і прамоцыі кніжнай спадчыны ў інфармацыйнай прасторы.

Дадатная дынаміка стварэння і распаўсюджвання кнігазнаўчай інфармацыі і пашырэнне яе тэматыкі, пачынаючы з сярэдзіны 1990-х гг., паспрыяла наступнаму кроку – крышталізацыі ведаў пра кнігу, заснаванню і ўдасканаленню структуры і змястоўнага кантэнта прафесійных выданняў, неабходных для фарміравання інфармацыйнай адукацыйнай прасторы па кнігазнаўстве. Адначасова, як можна заўважыць, недастае абагульняючых тэарэтычных і гістарычных прац [2], спланаванай узаемазвязанай каардынацыйнай дзейнасці, таму актуальнымі застаюцца пытанні даследавання, развіцця і сучаснага стану беларускай навукі пра кнігу; культываванне рэцэнзійнай і перакладчыцкай працы, каментавання і аналізу ў галіне кнігазнаўства; выпрацоўка адзіных падыходаў да фундаментальных тэрміналагічных пытанняў; бібліяграфічнае забеспячэнне гісторыі беларускага кнігазнаўства. Вырашэнне дадзеных пытанняў патрабуе новых падыходаў у падрыхтоўцы кадраў, якія на практыцы, у навукова-даследчых аддзелах кнігазнаўства былі б здольныя якасна іх ажыццяўляць. Праца з кнігай, а тым больш з кніжным помнікам, вымагае значнага багажу высокапрафесійных кнігазнаўчых ведаў, выкладанне якіх неабходна распрацаваць і аднавіць, выкарыстоўваючы назапашаны вопыт НББ і ЦНБ НАНБ, пашыраць у працэсе навучання спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы ўжо на ўзроўні бакалаўрэата, а таксама магістратуры, аспірантуры і дактаран-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры. У гэтым кірунку павінна, у першую чаргу, праявіцца ўзаемадзеянне тэорыі і практыкі, навукі і адукацыі, накіраваных на задавальненне патрэб як практычнай, так і даследчай дзейнасці ў галіне кнігазнаўства, якое мае багацейшы матывацыйны патэнцыял для падрыхтоўкі кампетэнтных спецыялістаў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці.


1. *Герасімаў, В.* Узлёты і падзенні кнігі і кніжніц Беларусі за апошнія тры тысячагоддзі: асабісты «гамбургскі рахунак» / В. Герасімаў // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. прац / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – Вып. 5. – С. 167.

2. *Доўнар, Л. І.* Беларуская навука пра кнігу: набыткі і праблемы / Л. І. Доўнар // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы Междунар. науч. семинара (Минск, 2–3 апр. 2014 г.). – Минск ; М., 2014. – С. 18–21.

3. История ЦНБ НАН Беларуси [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://csl.bas-net.by/Web/Pages/history.asp. – Дата доступу: 20.11.2017.

4. *Киреева, Г. В.* Национальная библиотека Беларуси как центр книговедческих исследований / Г. В. Киреева // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2008. – Вып. 2. – С. 76–90.

5. Навукова-даследчы аддзел кнігазнаўства [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://portal.nlb.by/portal/page/portal/index/content?lang=be&classId=7C30A1D7C7CF47369111EB5694A9DCB6. – Дата доступу: 20.11.2017.

6. Путь длинною в полстолетия: к 50-летию образования отдела редких книг и рукописей Центральной научной библиотеки им. Якуба Коласа НАН Беларуси / сост.: А. В. Стефанович, М. М. Лис ; ред. библиогр. записей И. Л. Мурашова ; редкол.: А. И. Груша (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – 357 с. : ил.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***О. Н. Елисеенков,***
*доцент кафедры искусства эстрады*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*

## АНАТОЛИЙ ЯРМОЛЕНКО: ЮБИЛЕЙНЫЙ ПАРАФРАЗ

Анатолий Ярмоленко начал музыкальную деятельность в Ансамбле песни и пляски Дома офицеров Бакинского военного